# Інфармацыя пра зліткавыя (інвестыцыйныя) манеты

Зліткавыя (інвестыцыйныя) манеты з'яўляюцца законным плацежным сродкам Рэспублікі Беларусь, праходзяць кантроль якасці і пры выпуску ў абарачэнне Нацыянальным банкам маюць належную якасць. Дапускаецца продаж зліткавых (інвестыцыйных) манет, якія могуць мець дапушчальныя тэхналагічна абумоўленыя адхіленні (бачныя няўзброеным вокам малапрыметныя драпіны, нязначныя скосы, выбоіны і завусеніцы на канце і гурце, вар'іраванне інтэнсіўнасці бляску мацiраванай паверхні на зліткавых (інвестыцыйных) манетах), наяўнасць якіх не з'яўляецца падставай для аднясення іх да зліткавых (інвестыцыйных) манет неналежнай якасці.

Зліткавыя (інвестыцыйныя) манеты прадаюцца па адпускных цэнах, якія адрозніваюцца ад намінальнага кошту, і могуць з'яўляцца прадметамі калекцыянавання, а таксама прымацца банкамі па намінальным кошце ў якасці законнага плацежнага сродку Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Зліткавыя (інвестыцыйныя) манеты пры захоўванні як да, так і пасля іх продажу падвержаны натуральнаму працэсу акіслення, па прычыне якога могуць узнікаць нязначныя плямы на паверхні зліткавых (інвестыцыйных) манет. Наяўнасць плям не адбіваецца на спажывецкіх уласцівасцях зліткавай (інвестыцыйнай) манеты, не ўплывае на ўтрыманне каштоўнага металу ў зліткавай (інвестыцыйнай) манеце і не з'яўляецца перашкодай для продажу зліткавых (інвестыцыйных) манет.

Зліткавыя (інвестыцыйныя) манеты рэкамендуецца захоўваць у капсуле, блістарнай упакоўцы, футляры, каб пазбегнуць дадатковага кантакту са знешнім асяроддзем і парушэння паверхні зліткавых (інвестыцыйных) манет. Капсулу, блістарную ўпакоўку, у якую змешчана зліткавая (інвестыцыйная) манета, распакоўваць не рэкамендуецца.